німія Беларусі: (На фоне этнічнай гісторыі)» (1993), «Белая Русь і беларусы: (У пошуках вытокаў)» (1994), «Родныя назвы: тапанімічны слоўнік Гомеля і наваколля» (2003), «Тапанімічны слоўнік Веткаўскага раёна, Гомеля і наваколля» (2003), «Тапанімічны слоўнік Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці» (2004), «Ад Гаміюка да Гомеля: гарадская даўніна ў фактах, імёнах, асобах» (2-е выд., 2006), «Імя і вобраз: мастацкая функцыя імён уласных у літаратурных творах і казках» (2007), «Геаграфічныя назвы ў калейдаскопе часоў» (2008) і інш.

*Тв.*: Мир, человек, язык (опыт философии языка). Гомель, 2010; Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі). 2-е выд. Гомель, 2011; Эзотерическнй мир н язык. Гомель, 2011; Скрытый смысл географических названий, легенд и преданий (на материале Беларуси). Гомель, 2012; Топонимнческнй словарь Гомеля и Гомельского района. Гомель, 2012; Человек в эзотерической реальностн. Гомель, 2013; Древнейшнй язык Земли. Гомель, 2013.

**РОД ЛІТАРАТУ́РНЫ**, шэраг літаратурных твораў, падобных па тыпу сваёй моўнай арганізацыі і пазнавальнай накіраванасці на аб'ект ці суб'ект, ці сам акт маст. выказвання. Упершыню пра Р.л. ўпамінае Платон у трактаце «Дзяржава». Больш поўна тэорыю Р.л. распрацаваў у сваёй «Паэтыцы» Арыстоцель. Традыцыйна вылучаюцца тры Р.л.: *эпас*, *лірыка*, *драма*. Кожны з іх адпавядае пэўна вызначанай функцыі слова [рэпрэзентатыўнай, эматыўнай (вынік адлюстравання эмоцый у слове), камунікатыўнай] і распрацоўвае яе эстэтычную спецыфіку. У сваю чаргу Р.л. дзеляцца на віды: эпас — на эпапею, раман, аповесць, апавяданне, навелу і інш., драма — на камедыю, трагедыю і ўласна драму, лірыка — на паэму, верш, песню і інш. Часам у якасці Р.л. вылучаюць сатыру і кінатэледраматургію. Літ. віды ў сваю чаргу дзеляцца на *жанры*. Аднак падзел л-ры на роды не супадае з яе падзелам на паэзію і прозу. У пабытавай мове лірычны твор звычайна суадносіцца з паэзіяй, а эпічны — з прозай. Але кожны Р.л. ўключае ў сябе і паэт. (вершаваныя), і празаічныя творы. Эпас на ранніх этапах мастацтва быў пераважна вершаваны, характэрны і для бел. л-ры: «Новая зямля» Я.Коласа. Паміж рознымі Р.л. існуе цесная сувязь. Сучасны раман мае прыкметы не толькі эпасу, але і лірыкі (лірычныя адступленні, лірычная танальнасць апісання з'яў і падзей) і драмы (напружанае дзеянне, маналогі і дыялогі). У некаторых творах (напр. паэме, баладзе) сувязь гэтая настолькі адчувальная, што гаворка можа ісці пра ліра-эпас як своеасаблівае міжродавае ўтварэнне.

**РОД** у г р а м а т ы ц ы, лексіка-граматычная катэгорыя, уласцівая імёнам, некаторым разрадам займеннікаў, а таксама дзеясловам у формах адзіночнага ліку прошлага часу і ўмоўнага ладу, якая праяўляецца ў іх здольнасці спалучацца з формамі дапасаваных слоў. І семантычныя, і фармальныя падставы родавай класіфікацыі размытыя і не супадаюць у розных часцінах мовы. Першапачаткова катэгорыя Р. выражала проціпастаўленне па біял. прымеце. Асн. носьбітам граматычнага значэння Р. як самастойнай граматычнай катэгорыі з'яўляецца Р. імён назоўнікаў — марфалагічная катэгорыя, прадстаўленая як проціпастаўленне 3 класаў слоў — мужчынскага Р. (палын, крок, бацька), жаночага Р. (сенажаць, дарога, зіма) і ніякага Р. (малако, цяля, полымя). Асаблівае месца займаюць назоўнікі агульнага Р. — экспрэсіўна афарбаваныя абазначэнні асоб абодвух полаў (плакса, малайчына, гуляка). Марфалагічна Р. назоўнікаў выражаецца сістэмай канчаткаў слова ў адзіночным ліку, сінтаксічна — формамі дапасаванага слова. Р. прыметнікаў, дзеяслоўных форм, некаторых займеннікаў з'яўляецца пераменнай катэгорыяй, яны дапасуюцца ў Р. да адпаведных назоўнікаў.

*Літ.*: Граматыка беларускай мовы. Т. 1: Марфалогія. Мінск, 1962; Беларуская граматыка. Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Нацыян. Мінск, 1985; Ш у б а П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Р а г а ў ц о ў В.І. Агульнае мовазнаўства. Магілёў, 2006.

*Д.В.Дзят.*

**РО́ДЗЕВІЧ** Леапольд Іванавіч (12.6.1895, фальварак Кур'янаўшчына, цяпер Лагойскі р-н — 1938?), беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, пісьменнік. Вучыўся ў Камуніст. ун-це нац. меншасцей Захаду ў Маскве (1923—24). З 1910 у Вільні, удзельнічаў у бел. культ.-асветным і рэв. руху, выступаў у Бел. муз.-драм. гуртку, Першай бел. трупе І.Буйніцкага. У 1921—23 кіраваў Бел. драм. майстэрняй, рэдагаваў газ. «Беларускі звон», «Наша будучыня». З 1922 у Бел. рэв. арг-цыі, чл. яе ЦК і рэдактар газ. «Наш сцяг». У 1924 сакратар Гродзенскага акруговага к-та КПЗБ, з 1925 у прадстаўніцтве ЦК КПЗБ пры Камінтэрне. У 1925—33 супрацоўнічаў у газ. «Чырвоны сцяг», час. «Бальшавік», працаваў у Камісіі па вывучэнні Зах. Беларусі пры АН БССР. Аўтар драм «Блуднікі» (1912, апубл. ў 1960), «Пакрыўджаныя» (1916, апубл. ў 1921), вадэвіляў, у т.л. «Збянтэжаны Саўка» (1921), «Багаты і бедны» (1922), зб-каў паэзіі «Беларусь» (1922), «На паняволеных гонях» (1928), апавяданняў «Рэвалюцыйным шляхам» (1928), «Касцёр барацьбы» (1930) і інш. У 1933 і 1938 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1956.

**«РО́ДНАЕ СЛО́ВА»**, ілюстраваны навукова-метадычны часопіс. Заснавальнік — Мін-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь. Выдаецца з 1988 у Мінску на бел. мове штомесячна. Спачатку называўся «Беларуская мова і літаратура ў школе», з 1992 сучасная назва. Асвятляе кірункі развіцця нац. школы, пед. майстэрства, дасягненні філалогіі, дзейнасць літ. музеяў, арганізацыю пазакласных мерапрыемстваў, алімпіядны рух. Публікуе матэрыялы па сусв. і бел. літ.-знаўстве, мовазнаўстве, фалькларыстыцы, міфалогіі, выяўл. мастацтве, музыцы,